кольскага, Г.М.Ліўшыца, В.П.Оргіша, В.Р.Тарасенкі. Прычыны ўвядзення хрысціянства на Русі, яго месца і ролю ў гісторыі Рас. дзяржавы і Беларусі на розных этапах даследавалі М.М.Нікольскі, М.С.Корзун, Г.М.Філіст, В.А.Молакаў, В.М.Лісічкін, В.М.Чараніца, Г.А.Мярзлова і інш. Каталіцкую царкву вывучалі Я.Н.Мараш, Я.М.Бабосаў, К.К.Койта, У.Г.Доктараў, Дз.М.Мацяс. У калектыўнай манаграфіі «Каталіцызм у Беларусі: традыцыяналізм і прыстасаванне» (1987) на гіст. і сацыялаг. матэрыяле выкладзена гісторыя каталіцкай царквы на Беларусі, дадзена характарыстыка стану і тэндэнцыі развіцця рэліг. свядомасці, духоўнага свету яе прыхільнікаў. Уклад у вывучэнне уніяцтва і Брэсцкай уніі 1596 зрабілі М.В.Каяловіч, Я.Н.Мараш, М.Гайдук, С.А.Падокшын, В.Ф.Гапановіч, Л.А.Царанкоў, Л.С.Абэцэдарскі, І.Ф.Рэкуц, Л.Я.Крыштаповіч, І.В.Катляроў. Праблема стараабраднiцтва і яго гісторыя на Беларусі раскрыта ў працах К.С.Пракошынай, Г.А.Чуднікавай, Т.П.Кароткай, А.Л.Гарбацкага. Гісторыю і дзейнасць рэліг. пратэстантызму і сектанцтва ў Беларусі вывучалі І.І.Акінчыц, А.В.Дзячэнка, К.С.Пракошына, Р.В.Надольскі, Т.Б.Блінова, С.Ф.Цярохін, Б.І.Камейша, Д.Хайтун, П.Капаевіч, П.М.Кірушын, Н.Бяліна-Падгаецкі, М.Я.Ленсу, В.Р.Языковіч, Г.А.Марцірасаў, В.Д.Лапцёнак і інш. У 1969 выдадзена калектыўная манаграфія «Баптызм і баптысты (Сацыялагічны нарыс)» пад рэдакцыяй Ленсу і Пракошынай. У 1920—30-я г. па іудаізме, сіянізме і антысемітызме выдадзены працы М.М.Нікольскага, С.Я.Вальфсона, Г.Фарбера, Г.Ледата, А.Д.Кіржніца, Л.Розергаўза і інш. У пасляваен. гады гэтымі пытаннямі займаліся М.М.Нікольскі, Г.М.Ліўшыц, Я.К.Анішчанка, У.Я.Бягун, В.А.Семянюк. Гісторыя рэліг. канфесій у Беларусі адлюстравана ў калект. [«Канфесіі на Беларусі (канец XVIII—XX стст.)» (1998), энцыклапедычны даведнік «Рэлігія і царква на Беларусі» (2001)] і індывід. працах А.Мартаса, А.У.Верашчагінай, А.В.Гурко, Т.В.Апіёка, Г.М.Шэйкіна і інш.

Заснавальнікам навук. аналізу Бібліі ў сав., рус. і бел. гістарыяграфіі з'яўляецца М.М.Нікольскі, які прысвяціў гэтай праблеме больш за 10 даследаванняў: «Ісус і першыя хрысціянскія абшчыны» (1918), «Керубы паводле звестак Бібліі і ўсходняй археалогіі» (1922), «Сляды магічнай літаратуры па кнізе Псалмоў» (1923), «Хецкія законы і іх уплыў на заканадаўства «Пяцікніжжа» (1928), «Апакаліптычная літаратура» (1929), «Праблемы крытыкі Бібліі ў савецкай навуцы» (1938), «Крызіс «крытычнай» біблеістыкі і задачы марксісцкай гістарычнай навукі» (1939) і інш. Выдадзены кнігі Г.М.Ліўшыца «Нарысы гістарыяграфіі Бібліі і ранняга хрысціянства» (1970), «Тэярдызм: спроба сінтэзу навукі і хрысціянства» (1970) Бабосава, «Філасофія сучаснага праваслаўя. Крытычны нарыс» (1968) В.А. Молакава. Аналізу Бібліі прысвечаны таксама працы Дз.І.Даўгялы, А.А.Круглова, В.Р.Тарасенкі, Ф.С.Таратунскага, Ленсу, В.А.Васільева, Г.В.Сінілы.

Сутнасць рэліг. свят, таінстваў і абрадаў прааналізаваны ў працах М.М.Нікольскага, Г.М.Ліўшыца, В.А.Фядосіка, У.А.Васілевіча, В.Дз.Ліцвінкі, А.А.Лозкі, І.І.Крука, С.Р.Шуцкага. Праблеме несумяшчальнасці навукі і рэлігіі прысвечаны даследаванні Г.А.Гурава, В.А.Молакава, І.А.Рабкова, Васільева і інш. Гісторыю ісламу на Беларусі, яго веравучэнне і культ даследавалі С.У.Думін, І.Б.Канапацкі, А.І.Лакотка, М.С.Мамаразакаў, А.І.Смолік. Выдадзена калект. праца «Вывучэнне і захаванне культурнай спадчыны татарскага народа ў Беларусі» (1999). Пытанні сацыялогіі рэлігіі і рэлігійнасці насельніцтва Беларусі ў розныя перыяды даследавалі Вальфсон, С.М.Рывес, Б.Э. Быхоўскі, Я.М.Бабосаў, С.Д.Лапцёнак, Г.М.Сакалова, А.М.Елсукоў, Д.К.Безнюк. Узаемаадносіны царквы і дзяржавы на розных этапах аналізавалі М.Шэйман, А.А.Круглоў, І.Ф.Рэкуц, А.А.Цітавец, Л.Я.Землякоў і інш. Адносіны бел. народа да рэлігіі і вераванняў даследавалі А.К.Сержпутоўскі, А.Ф.Фядосік, С.І.Васілёнак, М.М.Нікольскі, К.П.Кабашнікаў, І.М.Лушчыцкі, Л.Л.Кароткая, агульныя пытанні рэлігіязнаўства — А.С.Карлюк, І.М.Лушчыцкі, А.А.Круглоў, В.В.Кудраўцаў, П.І.Касцюковіч, В.А.Адзіночанка і інш.

Гісторыя вальнадумства і атэізму ў Беларусі, погляды асобных мысліцеляў мінулага (Ф.Скарына, С.Будны, К.Лышчынскі, К.Каліноўскі і інш.) асветлены ў працах С.А.Падокшына, К.С.Пракошынай, І.М.Лушчыцкага, С.К.Майхровіча, А.А.Біралы, А.А.Круглова, Н.П.Жука, І.В.Саверчанкі, М.А.Алексютовіча, А.Ф.Смірнова, Я.І.Парэцкага, В.Д.Дружчыца, Я.Л.Неміроўскага, В.Ф. Шалькевіча. Станаўленню і развіццю атэістычнай думкі прысвечана калектыўная манаграфія «З гісторыі вальнадумства і атэізму ў Беларусі» (1978) пад рэдакцыяй Бабосава і Ліўшыца. Вальнадумства і атэізм на розных этапах гісторыі разглядаюцца ў працах Г.М.Ліўшыца, «Вальнадумства і атэізм у старажытнасці і сярэднія вякі» (1973), «Вальнадумства і матэрыялістычная філасофія ў Заходняй Еўропе (2-я палова XVII ст.)» (1975), «Французскія асветнікі XVIII ст. пра рэлігію і царкву» (1976), «Атэізм Людвіга Феербаха» (1978), «Атэізм рускіх рэвалюцыйных дэмакратаў» (1979) і інш. Распрацоўваюцца розныя праблемы рэлігіязнаўства з розных светапоглядных і ідэалаг. пазіцый.

*Літ.*: Никольский Н.М. Религия как предмет науки. Мн., 1923; Яго ж. Яўрэйскія і хрысціянскія святы, іх паходжанне і гісторыя. Мн., 1930; Вальфсон С.Я. Сучасная рэлігійнасць. Мн., 1930; Алексютовіч М.А. Скарына, яго дзейнасць і светапогляд. Мн., 1958; Бабосов Е.М. Современный католицизм и наука. Мн., 1964; Лаптенок С.Д. Семья и религия. Мн., 1967; Подокшин С.А. Реформация и общественная мысль Белоруссии и Литвы (вторая половина XVI — начало XVII в.). Мн., 1970; Яго ж. Унія. Дзяржаўнасць. Культура: (Філасофска-гіст. аналіз). Мн., 1998; Прокошина Е.С. Очерки свободомыслия и атеизма в Белоруссии в XIX в. Мн., 1973; Из истории свободомыслия и атеизма в Белоруссии. Мн., 1978; Мараш Я.Н. Католическая церковь в истории Белоруссии. Мн., 1981; Короткая Т.П. Религиозная философия в Белоруссии начала XX в.: Крит. анализ. Мн., 1983; Круглов А.А. Свобода совести. Мн., 1986; Яго ж. Развитие атеизма в Белоруссии (1917—1987 гг.). Мн., 1989; Оргиш В.П. Античная философия и происхождение христианства. Мн., 1986; Надольский Р.В. Баптизм в прошлом и настоящем. Мн., 1987; Мартос А. Беларусь в исторической, государственной и церковной жизни. Мн., 1990; Мельников А.А. Путь непечален: история свидетельства о святости Белой Руси. Мн., 1992; Короткая Т.П., Прокошина Е.С., Чудникова А.А. Старообрядчество в Белоруссии. Мн., 1992; Канфесіі на Беларусі (канец XVIII—XX ст.). Мн., 1998; Акинчиц И.И. Современный верующий. Брест, 1999; Верашчагіна А.У., Гурко А.В. Гісторыя канфесій у Беларусі: мінулае і сучаснасць. Мн., 2000; Неокульты: «Новые религии» века? 3 изд. Мн., 2000; Рэлігія і царква на Беларусі: Энцыкл. давед. Мн., 2001; Земляков Л.Е. Религиозные процессы в Беларуси. Мн., 2001.

*А.А.Круглоў.*

## КУЛЬТУРАЛОГІЯ

Культуралагічныя даследаванні ў Беларусі пачаліся ў эпоху Адраджэння. Праблемы нац. і рэліг. самаідэнтыфікацыі, біблейскай і антычнай традыцый адлюстроўваліся ў творах Ф.Скарыны, С.Буднага, В.Цяпінскага, М.Сарбеўскага, Сімяона Полацкага, М.Смарыцкага, А.Філіповіча. Да навук. асэнсавання праблем айчыннай культуры бел. даследчыкі звярнуліся ў канцы 19 — пач. 20 ст. Пытанні бел. культуры закраналіся ў этнаграфічных і фальклорных працах Л.Бароўскага, П.А.Бяссонава, Я.Ф.Карскага, М.І.Каспяровіча, А.Г.Кіркора, Ю.Ф.Крачкоўскага, М.Я.Нікіфароўскага, Я.П.Тышкевіча, Е.Р.Раманава, І.А.Сербава, М.Федароўскага, П.В. Шэйна і інш. На аснове комплекснага параўнальна-гіст. абагульнення фактычнага матэрыялу яны абгрунтавалі нац. самабытнасць беларусаў як самастойнага народа, які стварыў сваю багатую і арыгінальную культуру. Культуралогія як частка комплекснай гуманіт. навукі фарміравалася на стыку гісторыі, філасофіі, сацыялогіі, псіхалогіі, антрапалогіі, этналогіі, мастацтвазнаўства, семіётыкі, лінгвістыкі і інш. навук.

У 2-й пал. 20 ст. вызначальную ролю ў распрацоўцы тэорыі і гісторыі айч. культуры адыгралі бел. вучоныя Г.І.Барышаў, Я.М.Бабосаў, Ю.А.Гусеў, Э.К.Да-

РЭПОЗІТОРЫЙ БДУКІ

рашэвіч, У.М.Конан, М.І.Крукоўскі, Г.А. Каханоўскі, А.Б.Ладыгіна, А.І.Лакотка, А.В.Мальдзіс, У.Ф.Мартынаў, І.В.Марозаў, В.Ф.Нячай, І.Д.Розенфельд, Я.М. Сахута, Р.Б.Смольскі, В.У.Пазнякоў, В.Ф.Шматаў і інш. У навук. працах разгледжаны праблемы развіцця бел. нацыі, сацыядынамікі культуры ў яе нац. традыцыях і асаблівасцях у кантэксце ўзаемадзеяння са станаўленнем і праяўленнямі спецыфічна бел. менталітэту, нац. самасвядомасці бел. народа ў мінулыя эпохі і ў сучасны перыяд. Бел. культуролагі даследуюць заканамернасці развіцця і функцыянавання культуры, яе структуру і дынаміку, (Я.М.Бабосаў, Э.К.Дарашэвіч, М.І.Крукоўскі, С.В.Лапіна, А.І.Смолік), этнічныя і духоўныя асновы культуры і быцця чалавека (Т.І.Адула, П.Р.Ігнатовіч, А.С.Майхровіч, Ю.В.Чарняўская), праблемы тэорыі каштоўнасці і варыятыўнасці культуры (А.М.Пакроўская), дыялектыку ментальнасці і нац. культуры, узаемадзеяння розных культур і цывілізацый свету (В.В.Брыгадзіна, Э.С.Дубянецкі, І.І.Касперава, У.П.Люкевіч). Новым кірункам у культуралогіі стала архітэктурная герменеўтыка (працы І.В. Марозава «Таямнічым шляхам Гермеса», 1994; «Архітэктурная герменеўтыка», 1999). Вывучэнню сутнасных праяў прыгажосці, што дэтэрмінуюць развіццё культуры, прысвечаны працы У.Ф.Мартынава «Філасофія прыгажосці» (1999) і «Эстэтыка» (2004). Вучоныя-культуролагі Ю.Г.Болатава, С.Л.Вілейка, А.А.Каспярук, І.Л.Коган, Э.А.Усоўская, Т.І.Якавук і інш. даследуюць аксіялагічныя асновы маст. культуры, пытанні генезісу, тыпалогіі і механізмаў захавання традыц. культуры, ролі і месца этыкі і рэлігіі ў структуры культ. арганізма.

У Бел. ун-це культуры падрыхтаваны і выдадзены працы, прысвечаныя ролі духоўнай культуры ў рэгуляцыі розных сфер сац. быцця ва ўмовах сістэмнай трансфармацыі грамадства, дзейнасці сацыякультурных інстытутаў, якія забяспечваюць функцыянаванне культуры: «Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме» А.І.Смоліка (1999), «Філасофія культуры: Уводзіны ў тэарэтычную культуралогію» М.І.Крукоўскага (2001), «Этнічныя асновы культуры» П.Р.Ігнатовіча і Ю.В.Чарняўскай (2001) і інш. Даследаванні культуры канкрэтных сац. арганізмаў, што існуюць у пэўных прасторава-часавых межах, а таксама культуры рэгіёнаў вядуцца ў Гродзенскім ун-це (І.В.Бусько, Э.А.Малько, С.З.Сямернік, І.Д.Розенфельд, М.А.Валковіч, Т.Р.Бараноўская). У Бел. ін-це праблем культуры (І.Б.Багачова, Р.Л.Бузук, І.І.Кулік, Л.І.Ракавецкая, У.П.Скараходаў) і Рэсп. ін-це вышэйшай школы (Ю.Ю.Гафарава, М.Р. Жбанкоў, В.У.Пазнякоў, Я.С.Яскевіч) праводзяцца фундаментальныя даследаванні асноў нац.-культ. развіцця ва ўмовах дэмакр. прававой дзяржавы, развіцця нар. творчасці і прафес. мастацтва, узаемадзеяння бел. культуры з інш. культурамі свету, распрацоўваецца канцэпцыя культуралагічнай адукацыі моладзі.

Выдадзены шэраг калект. і індывід. навуч. дапаможнікаў па культуралогіі, тэорыі і гісторыі культуры, асобных праблемах культуразнаўства і культурна-філас. антрапалогіі (В.В.Брыгадзіна, У.У.Качаноўскі, М.Д.Каўшараў, Н.А.Круталевіч, С.В.Лапіна, І.Я.Левяш, У.Ф. Мартынаў, Т.Я.Мінянкоў, С.Я.Парашкоў, Н.А.Рабцова, Ю.В. Чарняўская, І.Я.Шыршоў); навук. даведнік «Культура Беларусі XI—XIX ст.» А.І.Смоліка (1995). У 2003 выйшаў у свет энцыклапедычны даведнік Э.С.Дубянецкага «Культуралогія», у якім змест асн. паняццяў, тэрмінаў і феноменаў культуры арганічна ўвязаны з гісторыяй і рэальнымі працэсамі этнакультурнага развіцця бел. грамадства.

*Літ.*: Роль культуры в формировании личности. Мн., 1980; Ширшов И.Е. Динамика культуры. Мн., 1980; Майхрович А.С. Поиск истинного бытия и человека: Из истории философии и культуры Беларуси. Мн., 1992; Лыч Л.М., Навіцкі У.І. Гісторыя культуры Беларусі. Мн., 1996; Смолік А.І. Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме. Мн., 1999; Морозов И.В. Архетипы культуры: Основы культурологии. Мн., 2001; Потапенко Н.Я. Культура как самоорганизующаяся система. Мн., 2003; Саянкова Л.П. Массовая культура: Эволюция зрелищных форм. Мн., 2003.

*А.І.Смолік.*

## ПЕДАГАГІЧНЫЯ І ПСІХАЛАГІЧНЫЯ НАВУКІ

### ПЕДАГОГІКА

Педагагічная навука на Беларусі першапачаткова існавала як састаўная частка філас. або філас.-рэліг. вучэння. Заснавальнікам навук.-асветніцкага і этычна-дыдактычнага кірунку ў філас.-пед. літаратуры быў Ф.Скарына. Ён падкрэсліваў неабходнасць асветы і адукацыі для народа, прапагандаваў любоў да сваёй сям'і і Радзімы, распаўсюджваў хрысц. і рэнесансава-гуманіст. погляды на чалавека і мудрасць яго зямнога быцця на аснове божых запаветаў і высокіх духоўных пачуццяў. С.Будны крытыкаваў царк. сістэму навучання, лічыў, што феадалы павінны клапаціцца пра адукацыю простага народа на яго жывой бел. мове. Ён выдаў (пры садзеянні Л.Крышкоўскага і М.Кавячынскага) у Нясвіжскай друкарні на бел. мове падручнік для школ «Катэхізіс», па якім у пратэстанцкіх школах вывучалі асновы кальвіністкага вучэння і бел. мову. Пэўны ўклад у развіццё і станаўленне пед. думкі на Беларусі ў 16—17 ст. зрабілі дзеячы брацкіх школ, пед. сістэма якіх фарміравалася пад уплывам гуманіст. і рэфармацыйных ідэй. У брацкіх школах выкладалі Л. і С. Зізанії, М.Смятрыцкі. У 1596 Л.Зізаній выдаў у Віленскай брацкай друкарні азбуку «Наука ку читаню и розуменю писма словенского» з малюнкамі і «Лексісам» (тлумачальным слоўнікам з 1061 слова), які змяшчаў звесткі па гісторыі, геаграфіі, прыродазнаўстве. Значную ролю ў развіцці пед. думкі бел. і слав. народаў адыграла «Грамматики словенския правильная синтагма...» (1618—19) Смятрыцкага, якую М.В.Ламаносаў разам з «Арифметикой» Л.Ф.Магніцкага называў «вратами своей учености». Яна 2 стагоддзі была самым аўтарытэтным падручнікам па слав. мовазнаўстве, двойчы перавыдавалася ў Маскве (1648, 1721); у 18 — 1-й пал. 19 ст. стала ўзорам для сербскай, харвацкай, рум. і балг. граматык. У 1631 у Куцейне (каля Оршы) бел. друкар С.Собаль выдаў кнігу для першапачатковага навучання «Букварь сиречь начало учения детем начинающим чтению извыкати» (упершыню ўжыў назву «буквар»). Уклад у развіццё пед. думкі на Беларусі зрабіў Сімяон Полацкі, які лічыў, што ўсё зло ў грамадстве ўзнікае і распаўсюджваецца ад неадукаванасці і невуцтва людзей, а школа і настаўнікі — гал. выхавальнікі, якія павінны дасканала валодаць майстэрствам выхавання і вучыць дзяцей рабіць добрыя ўчынкі. Па ініцыятыве Сімяона Полацкага ў 1687 у Маскве засн. Славяна-грэка-лацінская акадэмія, у створанай ім друкарні выйшлі «Букварь» (1679), «Часослов» (1681). Прыкметны ўплыў на развіццё пед. думкі на Беларусі зрабілі члены Адукацыйнай камісіі — першай у Рэчы Паспалітай і Еўропе дзярж. установы па кіраўніцтве нар. асветай. Асветнікі С.Канарскі, Ян Снядэцкі, прафесары Віленскага ун-та А.Снядэцкі, А.Доўгірд распрацавалі навук. і метадычныя падыходы да вывучэння роднай мовы, школьных прадметаў, фіз. і гігіенічнага выхавання, умацавання здароўя дзяцей. Пасля далучэння Беларусі да Рас. імперыі на Беларусі атрымалі пашырэнне пед. ідэі А.М.Радзішчава, М.І.Навікова, Дз.С.Анічкава, К.Дз.Ушынскага, В.І.Вадавозава, В.П.Вахцерава, У.Я.Стаюніна, Дз.Дз.Сямёнава і інш. Бел. паэты-дэмакраты Ф.Багушэвіч, А.Гурыновіч, Я.Лучына адстойвалі правы бел. народа на асвету, родную мову, літаратуру, нар. педагогіку. Бел. этнограф і фалькларыст Е.Р.Раманаў выступаў за развіццё нац. культуры, мовы, навукі і літаратуры, напісаў для дзяцей беларусаў «Падручнік рускай граматыкі» (1881). У 1862 у Варшаве выдадзены на бел. мове буквар-катэхізіс «Элементаж для добрых дзетак...» грамадскага дзеяча лі-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ